# М1ЖНАРОДНАЕ УЗАЕМАДЗЕЯННЕ У СФЕРЫ ПРАВА ПЕРЫЯДУ ВЯЛ1КАГА КНЯСТВА Л1ТОУСКАГА

***Т. І. Доунар,*** *доктар юрыдычных навук, прафесар*

З самай далёкай старажытнасщ адбывалася узаемадзеянне ус1х еурапейсшх народау у сферы права, у працэсе якога мел1 месца абмен звычаям^ прававым1 нормам1 і 1х запазычанне. Аб гэтым сведчаць дайшоушыя да нашага часу першыя шсаныя законы. Напрыклад, у міжнародным дагаворы 1229 г., заключаным паміж Смаленсшм, Вщебсшм і Полащим княствамі з Рыгай і Готскім берагам, які меу галоунай мэтай -«ажбы мир твърд был», гаварылася аб устанауленні добрасуседсшх адносін і свабодным гандлі па усёй Заходняй Дзвіне і Балтыйсшм узбярэжжы на падставе роУнасці бакоу і адзначалася: «Тая правда Латиньскому вьзяти у Русское земли у волости князя Смоленьского, и у Полотьского князя волости, и у Витебьского князя волости» [1, с. 57, 71].

У перыяд фарміравання Вялікага княства ЛітоУскага ішоУ актыуны працэс ушфшацш права, у ходзе якога не толыа перапрацоувалася уласнае звычаёвае права, але вывучауся еурапейсш прававы вопыт. Асабліва гэта стала характэрным пры ажыццяуленні кадыфшацш заканадауства у XVI ст., прынцыпы якой адбывалюя у рэчышчы агульнаеурапейскага кадыфшацый-нага працэсу, што з'явілася вышкам актыунага развіцця навукі права у Заходняй Еуропе, павелічэннем яе уплыву на судовую практыку. Асабліва гэта тычылася сістэмы рымскага права. На той час у Вялтм княстве добра былі вядомы усе нашрунш развіцця еурапейскай прававой навукі, чаму садзейнічалі агульн^1я тэндэнц^і еурапейскай фшасофскай і палітыка-прававой навукі, а таксама практыка падр^хтоУкі юрыстау праз еУрапейскія Універсітэты. Мног1я дзяржаун^я дзеячы і мысліцелі ВКЛ (Ф. Скарына, Л. Сапега, П. Раізій, А. Ратондус, Д. ДаманеУскі і шш.) атрымалі еурапейскую адукац^ю, што дапамагала ім потым у распрацоуцы тэарэтычных прававых пытанняу і практычных падстау для удасканалення дзеючага заканадауства і правядзення яго кадыфшацьп.

Развітае права павінна быць сютэмным, таму заканамерна, што прабелы у ім запауняліся субсідыярн^мі крыніцамі, якімі з'яуляліся на той час рымская сістэма права (прызнаная навукай як агульная), кананічнае, царкоунае і магдэбургскае права. Прынящце першага звода законау Вялікага княства ЛітоУскага - Статута 1529 г., асноунай крыніцай якога з'яуляуся звычай, вызначыла мяжу паміж партыкулярн^1м сярэднявечн^1м правам і новым сютэматызаваным заканадауствам і заклала трывалыя падставы для далейшага, больш прагрэаунага прававога развіцця.

У сярэдзіне XVI ст. у сувязі з шцыятывай «папраўы» Статута 1529 г. ствараецца новая статутавая камісія і ужо з 1551 г. праект новага Статута сютэматычна абмяркоуваецца на соймах дзяржавы (што само па сабе ужо сведчыць аб новым узроуш развіцця права). Статутавая камісія ул1чыла і

перапрацавала увесь сярэднявечны прававы вопыт, як уласны (бо прававая навука і высот узровень падрыхтоуш юрыдычных кадрау уносілі у судовую практыку элементы навукі права), так і агульнаеУрапейскі. Гэтаму працэсу садзейнічау удзел у камісіі асоб, якія быип добра дасведчаны у юрыспрудэнцыі. Вучоныя мяркуюць, што у статутавых камНях працавалі самыя знакамітыя мысліцелі, асветшш і дзяржауныя дзеячы: Ф. Скарына, Л. Сапега, жмудскі епіскап Ян Даманеусш, які быу выдатным знауцам сярэдневяковага права увогуле і асабліва кананічнага, а таксама такія выдатныя правазнауцы, як Павел Астравіцкі, Марщн Валадковіч, Станіслау Нажускі і іinіi. Асаблівую ролю у падрыхтоуцы Статута 1566 г. адыгралі «дактары прау чужаземскіх» Аугусцін Ратондус і Петр Раізій. Апошні (Педро Руіз де Мароз па вучобе у Пад^ і Балоны) раней працавау прафесарам рымскага права Кракаускай акадэміі. А. Ратондус - доктар права Вгомбергскага ушверсгота, быу не толькі знауцам рымскага права, але і гюторыкам. Ён шмат зрабіу для выпрацоуш адзінай прававой тэрміналогіі. Прысутнасць іх у статутавай камісіі з'явглася падставай для надання Статуту рамашстычнага акаймлення. Удасканаленне статутавых палажэнняу ішло праз адаптацыю рамашстычных прававых паняццяу і праз успрыманне новых інстытутау, запазычаных з шстытуцый або Дыгестау. Пры супастау-ленні Статута 1566 г. з шстытуцыям1, Дыгестамі, помнікамі візантыйскага права вучоныя знаходзілі паміж імі генетычную сувязь [2, с. 52-53].

Аднак у адзначаны перыяд часу мела месца прытрымипванне прававой традыцып, напоуненай ужо новым зместам. Таксама і класічная рымская сістэма права не магла задаволщь заканадауцау. Менавгта таму, як адзначаюць вучоныя, у аснову Статутау заканадауцы паклалі уласную сістэму размяшчэння прававога матэрыялу, вельмі падобную на сучасную галіновую. Пасля прыняцця Статута 1566 г. кадыфшацыя і сютэматызацыя заканадауства у ВКЛ, як адзначаюць даследчыш, нашмат апярэдзша аналапчныя працэсы у суседніх дзяржавах [3, с. 170]. Больш дасканалы Статут 1588 г. увогуле стварауся на новых, больш прагрэ^уных прынцыпах права. У ім знайшлі яркае адлюстраванне тэндэнцыі усеагульнасці пісанага права і яго рацыяналізацыі. Ён быу пражшзаны ідэяй прававой дзяржавы, аб чым прама гаварыу Леу Сапега у прадмове да Статута. Абавязваючы суды шравацца пісаным правам, закон роб^ агаворку: «А где бы чого в том статуце не доставало, тогды суд, прихиляючыся до ближшое справедливости водле сумненья своего и прикладом иншых прав хрестияньских то отправовати и судити маеть» [4, раздз. 1, арт. 1]. Менавгта гэтым палажэннем прама была замацавана дапаможная роля замежнага права.

Аднак галоунай субсідыярнай крыніцай права некаторыя вучоныя (напрыклад, Ф. І. Леантовіч) лічылі «звычай старадауні», як у судовай практыцы быу больш пажаданы, чым замежнае права. Статут 1588 г. абавязвае вялікага князя «все привилеи земские стародавние, и ново от нас даные вольности и звычаи добрые стародавные ховати и ни в чом того не нарушати» [4, раздз. 3, арт. 15]. Хаця Н. А. Ма^ме^ка, як займауся

праблемамі крымшальнага права ВКЛ і вылучау як непасрэдна раманістычныя элементы, так і запазычаныя з магдэбургскага права, выказау меркаванне, што Ф. І. Леантовіч некалькі перабольшвау ролю звычаёвага права.

Па пытанню узаемадзення з рускгм (расшсшм) правам, большасць вучоных падзяляе думку, што права Вялшага княства знаходзшася на больш высокгм узроун і таму менавіта яно аказала значны уплыу на развіццё права Маскоускай дзяржавы. Сучасныя даследчыш сцвярджаюць, што тольк з часоу Пятра I «Россия была введена в западноевропейскую правовую семью» [5, с. 254]. Больш за усё вучоныя гаваршп аб Рускай Праудзе як крынщы права ВКЛ, аднак выказвалГ меркаванш, што радзГма яе знаходзГцца на тэрыторып ВКЛ і што, «заключая в своей основе общерусские начала права, она примыкает к специальной ветви, именно - к литовско-русскому (г. зн. беларускаму) праву» [6, с. 14]. МГнулыя даследчыш падкрэслГваюць найбольшы уплыу Статута 1588 г. на расшскае Саборнае Улажэнне 1649 г. Так, Н. А. Маклмейка тсау, што «московские судьи, вопреки закону, который предписывал при неполноте закона обращаться к законодательной власти, пользовались однако Литовским Статутом, который и был этим путем реципирован в Московском государстве» [7, с. 15]. М. Ф. УладзГмГрскг-Буданау таксама адзначау, што рэдактары Улажэння шмат запазычыцп са Статута 1588 г. і на палях арыпнальнага «свитка» Улажэння маецца 56 зауваг «из литовского» [8, с. 15-16]. Сярод вучоных, ямя звярталГ увагу на ролю Статута 1588 г. як адной з крынщ Улажэння, асаблГвае месца належыць выдатнаму гюторыку і знауцу прававых крынщ М. Н. ЩхамГраву. Ён адзначае дзейнасць царскай канцылярып, якая прыняла у якасцг узору найлепшы у Еуропе прыклад кадыфшацш права, прыстасоуваючы яго нормы да адносш Маскоускай Рус і шш. [9]

Па пытанню узаемадзеяння права ВКЛ з польскгм заканадауствам у навуковай лгтаратуры выказвалюя розныя меркаванш, аднак большасць вучоных схшялася да таго, што кадыфшацыйны працэс у Польшчы прыкладна супадау у часе з аналапчным працэсам у ВКЛ, а Статут 1588 г. адыгрывау ролю дапаможнага закону у практыцы польскгх судоу другоу паловы XVII і у XVIII ст. Польскгя вучоныя адзначалГ, што ён з'яуляуся дадатковым сродкам пры кадыфшацып права, што дазваляла лшввдаваць заганы і недахопы польскага права [10, с. 15]. АсаблГва узрастала роля Статута пры кадыфшацыйных работах. У 1775 г. каралева Марыя Тэрэза прызнала Статут як дапаможны закон у адносшах польскага спадчыннага права. АналГзуючы практыку польскгх судоу, Езеф Рафач звярнуу увагу на уплы/ крымшальнага права: са Статута быип узяты палажэнш у адносшах квалГфшаваных спосабау смяротнай кары за забойства шляхщца, аб адтэрмшоуцы смяротнага пакарання у адносшах цяжарных жанчын і шш. У XVI ст. быу прама уведзены у польскае заканадауства арт. 23 раздз. XI Статута. Не меншы уплыу адчувауся і у шшых галшах права, напрыклад, у працэсуальным праве. Пазней у перыяд рэформ XVIII ст. соймавая камгая

для распрацоукг кодэкса грамадзянскага права у 1790 г. узяла у якасцг узору таксама Статут 1588 г., а пры недахопе выкарыстоувала Статут Ласкага [2, с. 64-65].

Складальшш Статута 1588 г. звярталюя да польскага заканадауства (як заусёды звяртаюцца кадыфшатары да вопыта уах суседшх і Гншых дзяржау), але тольк для удакладнення пэуных рэдакцыйных пытанняу, не маючы за мэту запазычанне польскага закону. Яны розньшГ спосабамГ перапрацоувалГ, удакладюш палажэнн Статута, выключаючы казуютычны характар нормау, перагрупоуваючы Гх на падставе аднароднасщ зместу, удакладняючы фармулёукг і г. д. Гэта быу звычайны заканатворчы працэс, якг не мог нанесщ шкоду «нацыянальнаму характару права» [7, с. 127]. Аб тым, што польскае права было чужародным для ВКЛ, сведчыць наказ вялшага князя Жыпмонта панам радным і усёй шляхце ад 1538 г., дзе гаварылася: «... а пад право польское, которое собе земяне повету Бельского упросили, не подданы суть панове рада и вся земля Литовская, але овшем з него вызволены» [11].

Уплыу рымскага права на права ВКЛ праходзГу у асноуным апасрэдавана. У болыпасщ еурапейскгх краш перыяду сярэднявечча дактрына рымскага права пераважала. Для прававога развГцця таго часу характэрны сштэз канцэпцый «натуральнага» і «пазГтыунага» права. Рымскае права увогуле можна разглядаць як неабходны элемент развщця права. Прыватнае па сваёй сутнасщ, рымскае права можна разглядаць як адну з дактрынальных крынщ права ВКЛ. Усе сляды рымскага права у Статутах указваюць перш за усё не на сапраудныя Юстынгянаусшя крышцы, а на глосы Саксонскага Зярцала і магдэбургскае права. У еурапейсшм праве у сярэднявеччы яшчэ не рабшася спроба юрыдычнай сГстэматыкацып, якая б грунтавалася на агульных паняццях і паслядоуна праведзеных прынцыпах і якгя б пераутваралГ правапарадак у ГерархГчную сютэму паняццяу. Працэс і характар запазычання рымскага права крашамГ Заходняй Еуропы у эпоху сярэднявечча быу розным, аднак важным было тое, што, дзякуючы царкве і не у апошнюю чаргу еурапейскгм ушверсгтотам, гэтыя крашы нанава набшп агульную рэлЫйную, палГтычную, адмшютрацыйную і юрыдычную мову, якою стала латынь.

Нормы, паняцц і шстытуты рымскага права толькг тады станавшся дзеючым правам заходнееурапейскгх краш, а роуна і заходняй царквы, калГ Гх уводзш у дзеючае права праз заканадауства, або з дапамогай юрыдычнага тлумачэння. Вучоныя-юрысты глааравалГ, каменщравалГ і абагульюцп рымскае права, якое называлГ «служанкай канашчнага права». Рымскае і канашчнае права з'яулялюя неабходнымГ і заканамерньшГ элементамГ развГцця заходнееурапейскага права. Канашчнае права (або шакш сютэматы-заванае права царквы), створанае на працягу паутары стагоддзяу памГж 1050 і 1200 гг., стала дзеючым правам царквы, а рымскае права не з'яулялася такгм н у адным з палгтычных утварэнняу на Захадзе [12, с. 200]. Самае важнае адрозненне памГж рымскгм і канашчным правам на Захадзе заключа-лася у тым, што рымскае права, за рэдкгм выключэннем, успрымалася як

закончанае, нерухомае. Яго можна было тлумачыць, але нельга было змяняць. Канашчнае ж права, хаця і прыйшло таксама з мГнулых часоу пастаянна перапрацоувалася і мела якасць аргашчнага развГцця, свядомага росту на працягу стагоддзяу. Менавгта таму яно было некальк неулад-каваным, хаця, магчыма, больш щкавым адносна маральнага і палГтычнага погляду, таму так шмат увап вучоныя надавалГ і надаюць яму зараз.

Вучоныя, што даследавалГ права ВКЛ, разыходзяцца у меркаваннях адносна пачатку, межау і шляхоу уплыву замежных крынщ права. Некаторыя з Гх адзначалГ пэуныя рымскгя тэтрнцып праз канашчнае права, Саксонскае Зярцала, магдэбургскае права, Гншыя увогуле адмаулялГ уплыу рымскага права. І. І. Лаппо шсау аб уплыве рымскага права не тольк праз канашчнае і магдэбургскае права, але і з непасрэдных крынщ, спасылаючыся на памфлет «Размова паляка з лГцвшам», надрукаваны у 1564 г., у яшм цытуюцца шстытуцып, Дыгесты, Кодэкс, а таксама на некаторыя судовыя справы, змешчаныя у актавых юнгах [13, с. 138]. У сваю чаргу Н. А. Маюлмейка прызнавау, што кадыфшатары ВКЛ ведалГ аб рымскгм праве не толькг з гарадскгх нямецкгх кодэксау, але і з творау рымскгх юрыстау, польскага заканадауства, якое змяшчала значную прымешку рымскага права. Перш за усё ён звяртау увагу на творы Варфаламея Грощкага, якгя з'явшся у XVI ст. у Польшчы і ВКЛ) [7, с. 159-160]. Аднак працы В. ГроГцкага і П. ШчэрбГча, якгя мнопя даследчыю лГчаць крынщамГ магдэбургскага права і на Беларуа (хоць і у розных межах), самГ па сабе з'яулялюя перапрацоукай рымскага права. Так, Ф. В. Тараноускг сцвярджау, што В. Грощю запоушу прабелы магдэбургскага права рымскгмГ палажэннямГ [14, с. 157-158].

Патрэбы прававога развГцця забяспечвалюя і рэцэпцыяй з Гншых прававых сютэм неабходных нормау і шстытутау і, як ужо адзначалася, рэцэпцыя рымскага права у большасщ адбывалася апасрэдавана. ГалоунымГ элементамГ у развГщц тагачасных нацыянальных прававых сютэм был: мясцовае (земскае) права, канашчнае або царкоунае і гарадское. Параунoуваючы некаторыя грамадзянска-прававыя шстытуты ВКЛ, Польшчы і Пруси, В. СпасовГч зауважыу, што яны адрозшваюцца толькг па форме, але прасякнуты адной даяй і нельга не зауважыць у Гх роднасщ, падабенства, а таксама узаемадапауняльнасщ [15, с. 19]. Несумненна, што у гэты перыяд еурапейскгя сютэмы права у пэунай меры дапауюцп адна адну, а у межах Рэчы Паспалгтай гэта тычылася і ВКЛ. Таксама з увядзеннем хрысщянства для некаторых прававых шстытутау характэрна непасрэдная сувязь рэлГги і права. АсаблГва гэта праяулялася у сютэме канашчнага права, якое рэгулявала досыць шырокае кола праваадносш, звязаных з мараллю. Суадноины рэлГгп і права у гютарычным развщщ змянялюя. Для усёй Еуропы, у тым лшу і для ВКЛ, стала характэрнай асноуная тэндэнцыя паступовага узмацнення ролГ свецкага права.

У XVI ст. пад канашчным правам перш за усё разумелГ сютэму нормау «Корпус юрыс каношцы», якая рэгулявала не толькг царкоуныя, але і свецкгя

адносГны (1582 г.), хаця увогуле да крынщ права каталГцкай сярэдневяковай царквы належаць і Гншыя пастановы, напрыклад, Дэкрэт Грацыя (XII ст.), Дэкрэт Грыгорыя IX (1234 г.) і шш. Да перыяду актыунай рэфармацы некаторыя шстытуты права каталГцкай царквы, асаблГва тыя, што рэгулявалГ шлюбныя адносшы, лГчылюя мГжнародньмг Пазней значныя змены у гэтыя адносГны бшп унесены Трыдзенскгм Саборам 1563-1564 гг. У гэты перыяд шлюбна-сямейнае каталГцкае і праваслаунае права у мнопм супадаюць.

Адной з прававых крынщ ВКЛ з'яулялася таксама і нямецкае гарадское права, больш вядомае як магдэбургскае. СпецыяльнымГ вялшакняжацамГ граматамГ давалася самакграванне беларускгм гарадам. Нягледзячы на тое, што яно уводзглася у адпаведнасщ з магдэбургскгм правам, крышцы яго часцей не удакладнялюя. У граматах цяжка знайсщ спасылк на Саксонскае Зярцала, Вейхбглльд або шшую заходнееурапейскую прававую крышцу. У старажытны перыяд статус беларускгх гарадоу рэгламентавауся уласным звычаёвым правам, якое у перыяд сярэднявечча зведала змены і было ужо дастаткова развгтым. Даследчык гюторып гарадскога права Беларуа З. Ю. Капыскг сцвярджау, што магдэбургскае права беларусшх гарадоу шмат у чым адрозшвалася ад заходнееурапейскага. Знойдзены З. Капыскгм Судзебшк г. Оршы грунтавауся на уласным звычаёвым праве, ён дапауняу магдэбургскае права і самастойна тлумачыу яго [16]. Увогуле, для найбольш распрацаваных прававых шстытутау і нормау не было неабходнасщ у рэцэпцш магдэбургскага права.

У цэлым права ВКЛ адчула уздзеянне мнопх прававых крынщ. Аднак перш за усё яно грунтавалася на старажытным уласным праве (спачатку беларусшм звычаёвым, а потым - удасканаленым агульнадзяржауным). Адносна статутавага заканадауства несумненна, што аб'ём нарматыуных палажэнняу уласнай «вытворчасцг» намнога пераузыходзГу запазычаныя. Нягледзячы на тое, што пры аналГзе гютарычных прававых крынщ розных еурапейскгх дзяржау можна сустрэць супадаючыя моманты, нельга адразу гаварыць аб непасрэднай рэцэпцш права. Патрэбна улГчваць усе абставшы законатворчай дзейнасцг Нездарма Н. Макамейка зауважыу, што гэта пытанне абмяркоувалася праф. ДангловГчам яшчэ у 1834 г., і яно праз 60 гадоу «не подвинулось» [7, с. 155]. На сучасным этапе даследавання лапчна зрабГць асноуны вывад, што нягледзячы на шмаппкгя навуковыя напрацоукг па дадзенай праблеме, тэма псторып прававога узаемадзеяння еурапейскгх народау яшчэ далёкая да завяршэння і у кантэксце параунальнага правазнауства патрабуе новых намаганняу.

## Cпіс выкарыстаных крын1ц

1. Памятники русского права. Памятники права феодально-раздробленной Руси. -М.: Госюриздат, 1959. Вып. 2. - 443 с.

2. *Bardach, J.* Statuty Litewskie - pomniki prawa doby odrodzenia / J. Bardach // Dzieje kodyfikacij i prawa. - Karpacz, 1974. - S. 1-118.

3. *Юхо, Я.А.* Каротю нарыс псторып дзяржавы і права Беларус / Я. А. Юхо. - Мгнск,
1992. - 270 с.
4. Статут Вялгкага княства Штоускага 1588 года: Тэксты, даведшк, каментарып / рэдкал.: І. П. Шамякш (гал. рэд.) [і шш.]. - Мгнск: БелСЭ, 1989. - 573 с.
5. *Аннерс, Э.* История европейского права / Э. Аннерс; пер. со швед. - М.: Наука,
1994. - 397 с.
6. *Максимейко, Н.А.* Русская Правда и литовско-русское право / Н. А. Максимейко. -Киев, 1904. - 14 с.
7. *Максимейко, Н.А.* Источники уголовных законов Литовского Статута / Н. А. Максимейко. - Киев, 1894. - 185 с.
8. *Владимирский-Буданов, М.Ф.* Обзор истории русского права / М. Ф. Владимирский-Буданов. - Ростов-н/Д.: Феникс, 1995. - 640 с.
9. *Тихомиров, М.Н.* Источниковедение истории СССР: учеб. пособие / М. Н. Тихомиров. - М., 1962. - 495 с.
10. *Makarewicz, N.* Polske prawo karne. Czesc ogylna / N. Makarewicz. - Lwow, 1919.
11. АЮЗР. Т. 1. - 1863. - № 101.
12. *Берман, Г.Дж.* Западная традиция права: эпоха формирования / Гарольд Дж. Бер-ман; пер. с англ. - М.: Изд-во МГУ, 1994. - 592 с.
13. *Лаппо, И.И.* Литовский Статут 1588 г. / И. И. Лаппо. - Ч. 1: Исследования. - Каунас, 1934. - 473 с.
14. *Тарановский, Ф.В.* Обзор памятников магдебургского права западнорусских городов литовской эпохи: Ист. юрид. исслед. / Ф. В. Тарановский // Адб. з «Варшав. унив. изв.», Кн. 7-9. - Варшава, 1897. - 201 с.
15. *Спасович, В.Д.* Об отношениях супругов по имуществу по древнему литовскому праву / В. Д. Спасович. - СПб, 1857. - 77 с.
16. *Копысский, З.Ю.* Магдебургское право в городах Белоруссии (конец XV - пер. половина XVII вв.) / З. Ю. Копысский // Советское славяноведение. - 1972. - № 5. - С. 2442.